**А. Макарэвіч**

# НАВЕЛА Ў ІСПАНСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ: АДМЕТНАСЦІ ГЕНЕЗІСУ І ЭВАЛЮЦЫІ РАЗВІЦЦЯ

Станаўленне і развіццё жанру навелы ў сусветнай літаратуры звязана са знакамітым зборнікам Дж. Бакача "Дэкамерон". З цягам часу гэты жанр распаўсюджваецца і ў іншых краінах свету, у тым ліку ў Іспаніі. Паступова іспанская навела пачынае развівацца асобна і набывае адметныя рысы. Выяўленне асаблівасцей генезісу і эвалюцыі навелы, вызначэнне яе жанравай спецыфікі ў іспанскай літаратуры адносіцца да ліку актуальных кірункаў даследавання з прычыны маладаследаванасці як у якасці асобнай з'явы, так і ў кампаратыўным аспекце.

У XII ст. у Іспаніі з’яўляецца макражанр *ejemplo*, які стаў пачаткам фарміравання іншых жанраў малой прозы. Навела і *ejemplo* мелі падобныя жанравыя рысы: статычнасць персанажаў, павярхоўнасць характараў, звядзенне канфлікту ў творах да барацьбы дабра і зла і г.д. На навелы XIV–XVI стст. значны ўплыў аказвае арабская літаратура, што выражаецца ў выбары сюжэтаў твораў. Перыяд з XVI па XVII ст. лічыцца росквітам іспанскай навелы. У гэты час на яе развіццё найбольшы ўплыў аказвае анекдот, што невыпадкова з прычыны агульных жанравых асаблівасцей: невялікі памер, мінімальная колькасць персанажаў, нераспрацаванасць характараў герояў і інш. У дадзены перыяд пачынаецца падзел навелы на “нізкую” і “высокую”. Для твораў XVII ст. характэрны ўплыў барока. У тэкстах гэтага перыяду адзначаецца страта ўнутранага стрыжня чалавека, яго маральных арыенціраў.

На працягу развіцця навелы найбольш распаўсюджанымі былі тры асноўныя тэрміны: *novela*, *cuento* і *novela corta*. Аднак у сучасным іспанскім літаратуразнаўстве тэрмін *novela* выкарыстоўваецца для азначэння рамана, а тэрмін *cuento* – апавядання або казкі. Тэрмін *novela corta* пашырана ўжываецца для абазначэння навелы – аповеда меншага памеру, чым раман, але без эканоміі апавядальных рэсурсаў, як у апавяданні.

Такім чынам, мы можам адзначыць, што навела ўзнікае з макражанру *ejemplo*, які дае аснову для фарміравання іншых жанраў малой формы, такіх як апавяданне, казка, прытча і іншыя. У працэсе развіцця навелы на яе аказваюць уплыў творы арабскага фальклору, рыцарскі, грэчаскі раман, але найбольшае значэнне мае анекдот. З цягам часу змянялася навелістычная жанравая тэрміналогія. Сярод найбольш распаўсюджаных вылучаюцца тэрміны *novela*, *cuento* і *novela corta*. У сучасным іспанскім літаратуразнаўстве для абазначэння навелы пашырана выкарыстоўваецца толькі тэрмін *novela corta*.